Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, ПРАФКОМАУ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАУНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

№ 28 (126) Серада, 17 студзеня 1990 года

## ТЭЛЕТАЙП

### Адбылося

пашыранае пасяджэнне Вучонага савета дзяржуніверсітэта. Разгледжаны наступныя пытанні:

Абранне па конкурсу.

Аб мерах па паляпшэнню метадычнай работы ва універсітэце.

Шляхі павышэння эфектыўнасці вучэбна-даследчай работы студэнтаў на завочным аддзяленні.

Абмеркаванне пастановы камітэта народнага кантролю БССР ад 22.11.89 г.

Аб рабоце аспірантуры па спецыяльнасці «Языкі народаў СССР» і «Педагагічная ўзроставая псіхалогія».

Зацвярджэнне плана па спецыяльнасці «Правазнаўства» для асоб, якія атрымліваюць другую вышэйшую адукацыю.

Аб інструктыўных дакументах.

Зацвярджэнне плана па навукова-даследчай рабоце.

Аб паскоранай падрыхтоўцы выкладчыкаў па польскай філалогіі.

Разгледжаны таксама іншыя пытанні.

Прыняты адпаведныя пастановы.

### Аб справах моладзі

У канцы мінулага тыдня адбылася XXVIII гарадская справаздачна-выбарчая камсамольская канферэнцыя. У яе рабоце ўдзельнічала і дэлегацыя студэнтаў нашага дзяржуніверсітэта ў колькасці 15 чалавек.

Размова ішла аб тым, чаго дасягнула моладзь горада Гродна за гады перабудовы ў краіне, якія пытанні засталіся па-за ўвагай, патрабуюць вырашэння. Напрыклад, настаў час узняцця ролі камсамола наогул, і асабліва школьнага, як палітычнай арганізацыі ў жыцці моладзі.

У выступленні на канферэнцыі сакратара камітэта камсамола дзяржуніверсітэта Канстанціна Шпектарава былі два асноўных напрамкі: што канкрэтна можа зрабіць студэнцкі камсамол у плане падрыхтоўкі высокакваліфікаванага маладога спецыяліста; як нарэшце вырашыць праблемы студэнцкага інтэрната!

Актыўна вялося абмеркаванне справаздачнага даклада. У многіх выступленнях была адзіная думка: Настаў час, калі трэба вызначыць сваю пазіцыю, акрэсліць напрамкі асноўнай дзейнасці. Галоўнае ж, чым павінен заняцца камсамол у бліжэйшы час — прыняць актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі з тым, каб найбольшая колькасць кандыдатаў у народныя дэпутаты ад камсамола прадстаўляла моладзь у органах народнай улады.

На арганізацыйным пленуме, які адбыўся пасля канферэнцыі, першым сакратаром гаркома камсамола абраны А. Падгорны, другім — В. Паталета, сакратаром — Т. Чыслова.

### УВАГА!

Газета адкрывае рубрыку «Пытанне — адказ» з тым, каб чытачы маглі атрымаць адказы кампетэнтных субяседнікаў на іх пытанні не толькі аб жыцці вуза, але вобласці, рэспублікі, краіны.

Тэлефон рэдакцыі — 44-80-70.

## ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ — СЕСІЯ

Пачалася экзаменацыйная праверка ў Г. Міскевіч і І. Белашэўскай, студэнтак другога курса матэматычнага факультэта. Да экзаменаў дзяўчаты рыхтуюцца вельмі сур'ёзна. І, што там казаць, прадметы больш складаныя, чым у папярэдняй сесіі: агульная фізіка, алгебра і тэорыя лікаў, і іншыя.

Студэнткі лічаць, што патрабаванні з боку выкладчыкаў заканамерна і справядліва павялічыліся. Сёння неабходна не толькі добрае веданне матэрыялу, але і ўменне працаваць на ЭВМ, прыводзіць практычныя прыклады, вырашаць складаныя матэматычныя праблемы.

Дапамагаюць у падрыхтоўцы да экзаменаў выкладчыкі. Створаны кансультацыйныя пункты, арганізавана дадатковая праца на электронна-вылічальных машынах. Г. Міскевіч і І. Белашэўская лічаць, што неабходна самастойна працаваць на працягу ўсяго семестра, навучальнага года, сістэматычна займацца ў чытальнай зале, у лабараторыях універсітэта.

Так, Ганна і Ірына задаволены тым, што паменшыўся час лекцыйных заняткаў, ёсць магчымасць больш часу аддаваць самаадукацыі. І вельмі спадзяюцца, што ўсе другакурснікі матэматычнага факультэта паспяхова здадуць зімовую сесію.





Знаемцеся: другая група матэматычнага факультэта, першакурснікі. Працуюць юнакі і дзяўчаты напружана, старанна. Вынік: паспяхова здаюць усе, што ў вучэбным плане.

Дарэчы, у групе лічаць, што менавіта ў гэтыя нялёгкія дні сесіі ўзмацнілася сяброўства, з'яднанасць калектыва, адкрываюцца такія рысы характару, як жаданне прыйсці таварышу на дапамогу, цвёрдасць у дасягненні намечанага і іншыя.

Матэматычны аналіз, алгебра і тэорыя лікаў, аналітычная геаметрыя, ЭВМ і праграміраванне, 10 залікаў — мнагавата для першай у жыцці сесіі. Такая думка першакурснікаў. Але старання матэматыкам не займаць. Пажадаем і мы ім поспехаў!

## Першыя вынікі

Студзень — знамянальны і адказны месяц для студэнтаў універсітэта. Кожны год у гэты час — зімовая сесія, пара вядомых хваляванняў, радасцей і, бывае, непрыемнасцей. Экзамены — праверка ведаў, набытых за навучальны год. Болей як 2.5 тысячы студэнтаў у цяперашнім годзе пераходзяць праз своеасаблівы бар'ер.

Самым складаным выпрабаваннем, безумоўна, сесія з'яўляецца для першакурснікаў новага факультэта фізічнага выхавання, беларускага, руска-польскага і беларуска-польскага аддзяленняў.

Кабінеты, чытальныя залы запоўнены да адказу. У экзаменацыйны час выразна відаць, што чытальнай залы універсітэта не хапае для падрыхтоўкі. Недастаткова і падручнікаў, «начнога» кніжнага фонду (магчымасці ўзяць падручнік дадому амаль не бывае).

З многімі студэнтамі мне давялося размаўляць. Усе яны выказвалі пэўную думку: нельга працаваць толькі з адной кнігай, неабходна і канспекты лекцый перачытаць, дасканала азнаёміцца з творамі класікаў марксізму-ленінізму, з манаграфіямі, цікавымі матэрыяламі, змешчанымі ў газетах і часопісах. Але ці магчыма працаваць сканцэнтравана ў нашай чытальнай зале, калі асноўная маса студэнтаў размаўляе тут у поўны голас, перашкаджаючы працаваць суседзям? Давайце ж, нарэшце, таварышы студэнты, будзем узаемна ўважлівымі, узаемаветлівымі і проста выхаванымі людзьмі.

А сесія крочыць па універсітэту. Студэнты здалі залікі, уперадзе ў многіх — галоўныя выпрабаванні, экзамены. Дарэчы, многія са студэнтаў здаюць у сесію экзамены датэрмінова па свайму жаданню.

Гэтыя радкі з размоў са студэнтамі філалагічнага факультэта.

**С. Міснікевіч**, студэнтка чацвертага курса філалагічнага факультэта:

— Цяперашняя сесія для нас — складаная. Як, наогул, і ўсе астатнія, бо кожны раз правяраеш у першую чаргу сам свае веды, сябе, сваю прафесійную падрыхтоўку, а ўжо толькі вынік падводзіць выкладчык, ставячы адзнаку ў заліковую кніжку.

Для нас, чацверакурснікаў, вельмі важна добра вытрымаць экзамены. Важна і тое, каб веды засталіся глыбокія, трывалыя. А прадметы такія, што іх добрае веданне вельмі важна для спецыялістаў-філолагаў: палітэканомія, гісторыя рускай літаратурнай мовы, гісторыя рускай савецкай літаратуры...

Вось ужо некалькі гадоў мы маем права самастойна, без указкі дэканатаў, выбіраць дзень здачы экзаменаў. Атрымалі магчымасць абмяркоўваць групай, знаходзіць лепшы для сябе варыянт і толькі папярэджваць аб гэтым экзаменацыйную камісію. Можам здаваць па свайму выбару экзамен датэрмінова. Спадзяемся, што выкладчыкам не прыйдзецца чырванець за сваіх навучэнцаў. А студэнтам жадаю паспяховай зімовай сесіі і толькі добрых адзнак.

**А. Данільчык**, студэнтка пятага курса філалагічнага факультэта:

— Гэтая зімовая сесія апошняя для нас, пяцікурснікаў. І нельга назваць яе лёгкай, хоць мы здаем толькі два экзамены: беларускую савецкую літаратуру і літаратуру народаў СССР.

Па-першае, адчуваецца большая адказнасць у студэнтаў выпускнога курса за свае веды, з якімі зусім скора пачнем самастойна працаваць. А, па-другое, сама сесія на беларускім аддзяленні складаная; да экзаменаў далучылі залік па літаратуры...

Хочацца звярнуцца да першакурснікаў. Першая сесія, як і ўсе малавядомае, безумоўна, выклікае ў вас і хваляванне, а ў некаторых нават жах. Адзінае, што па-сапраўднаму надасць вам упэўненасць — толькі трывалыя веды! І яшчэ добрая парада: не адкладвайце вывучэнне матэрыялу, літаратурных твораў на апошні дзень, дакладней, на апошнюю ноч!

Ад імя ўсіх пяцікурснікаў жадаю вам толькі добрых, выдатных адзнак, аптымізму, веры ў свае сілы!

Паспрабуем падвесці самыя першыя вынікі здачы цяперашняй сесіі. Выкладчыкі, дэканат матэматычнага факультэта задаволены становішчам спраў. Студэнты паспяхова здаюць залікі, амаль няма выпадкаў, каб былі нездавальняючыя адзнакі (за выключэннем двух «незалікаў» па матаналізу). Сесія на матфаку толькі стартуе, але, адчуваецца, і фініш будзе выдатным.

Звернемся да філолагаў. Тут некалькі іншая справа. Ужо першыя выпрабаванні многім студэнтам проста не пад сілу. Шмат слабых адказаў, невядома, як некаторыя змогуць адолець экзаменацыйныя пытанні. Але радуе тое, што добра з першых крокаў вучобы зарэкамендавалі сябе студэнты беларускага, беларуска-польскага і руска-польскага аддзяленняў.

На астатніх факультэтах толькі пачаліся залікі. Аб выніках гаварыць рана. Застаецца толькі пажадаць студэнтам шчаслівых білетаў, выкладчыкам — добра падрыхтаваных студэнтаў. А ўсім традыцыйнае ні пуха, ні пяра!

Н. БЕДЗЬ.

## АВАЛОДВАЦЬ ГРАМАДЗЯНСКАЙ АБАРОНАЙ, АСНОВАМІ МЕДЫЦЫНСКІХ ВЕДАЎ І АХОВЫ ЗДАРОЎЯ ДЗЯЦЕЙ

Самай патаемнай і дарагой мэтай для ўсіх народаў, на якім бы кантыненце яны не жылі, на працягу ўсёй гісторыі чалавецтва была мара аб трывалым і працяглым міры, аб поўным знішчэнні войнаў на зямлі. Вайна заўсёды прыносіла народу цяжкія бядоты і пакуты, каштавала вялікіх чалавечых ахвяр, разбурала матэрыяльныя і культурныя цэннасці, створаныя працай і геніямі многіх пакаленняў людзей. У памяці народаў свежыя ўспаміны пра тыя жахі і няшчасці, якія абрушыліся на чалавецтва ў нашым стагоддзі — дзве міравыя вайны, незваротна панёсшыя з сабой дзесяткі мільёнаў чалавечых жыццяў.

У цяперашні час, калі ў ваенных справах прайшоў каласальны тэхнічны пераварот і з'явіліся ракетна-ядзернае ўзбраенне і іншыя сродкі масавага знішчэння, якія валодаюць вялікай сілай, праблема прадухілення міравой вайны і забеспячэння на зямлі трывалага міру стала асабліва злабадзённай і вострай. Але калі здарыцца такое, што будзе немажліва прадухіліць вайну, то для таго, каб паменшыць чалавечыя згубы, трэба ўмець дзейнічаць у ваенных абставінах, а гэтаму вучыць грамадзянская абарона і медыцынская падрыхтоўка.

Ваенна-палітычнае кіраўніцтва краін НАТА разглядае далейшае развіццё сваёй грамадзянскай абароны як частку агульных ваенных прыгатаванняў. Яе прызначэнне, з пункту гледжання буржуазных ваенных спецыялістаў, — забяспечыць выжыванне насельніцтва, эканомікі дзяржавы ва ўмовах любой вайны, асабліва ракетна-ядзернай.

Асноўнымі задачамі грамадзянскай абароны СССР з'яўляюцца:

1. Ахова насельніцтва ад зброі масавага знішчэння і іншых сродкаў нападзення ворага. На выкананне гэтай задачы накіраваны комплекс розных мерапрыемстваў: укрыццё насельніцтва ў ахоўных збудаваннях; разгрупаванне і эвакуацыя, прымяненне індывідуальных і медыцынскіх сродкаў аховы.

2. Павышэнне ўстойлівасці работы аб'ектаў і галін народнай гаспадаркі ва ўмовах ваеннага часу.

3. Правядзенне выратавальных і неадкладных аварыйна-аднаўленчых работ у ачагах паражэння і ў зонах стыхійных бядот, якія, на жаль, нярэдка праходзяць і на тэрыторыі нашай краіны: землятрасенні ў Сярэдняй Азіі і Закаўказзя, навадненні ў Беларусі і на Далёкім Усходзе, снежныя заносы на Сахаліне і ў Малдавіі, апоўзні ў горных раёнах Крыму, Каўказа і Карпатаў, лясныя і тарфяныя пажары ў РСФСР. Па сутнасці справы, няма раёна, дзе не было б небяспекі той ці іншай стыхійнай бядоты.

Да цяжкіх вынікаў прыводзяць і вялікія аварыі, катастрофы. У выніку гэтага гінуць і атрымліваюць траўмы тысячы і мільёны людзей, якія церпяць нястачу першай неабходнай дапамогі. Сярод пацярпеўшых — дзеці. Вось дзе, таварышы студэнты, могуць спатрэбіцца вашыя медыцынскія веды, ад якіх вы так несвядома адказваецеся. Людзі часта гінуць не ад смяротных ранаў, а ад таго, што ім своечасова не была аказана першая дапамога. Акрамя таго, ва ўказаннях дзяржаўнага камітэта СССР па народнай адукацыі прама сказана, што навучанне студэнтаў універсітэта грамадзянскай абароне з'яўляецца часткай медыкагігіенічнага выхавання, неабходна падрыхтоўка студэнтаў да практычнай работы па аказанню медыцынскай дапамогі ва ўмовах абставін, па дагляду за хворымі і пацярпеўшымі, выкладанню грамадзянскай абароны ў 2, 5, 6 класах і медыка-санітарнай падрыхтоўцы ў школе.

Атрыманыя медыцынскія веды будуць садзейнічаць пашырэнню далягляду, фарміраванню асобы і павышэнню прафесіянальнага ўзроўню настаўніка, яго сумленнаму медыка-педагагічнаму падыходу да праблем навучання і выхавання, а таксама ахове здароўя дзяцей з улікам іх узросту і асабістых мажлівасцей. Правазнаўцам такія веды таксама спатрэбяцца ў іх практычнай рабоце. Элементарныя медыцынскія веды студэнтам будуць патрэбны як будучым маці і бацькам.

Некаторыя студэнты ўпэўнены ў тым, што і без медыцыны яны ведаюць, як аказаць першую медыцынскую дапамогу. Я лічу, што гэта абман сябе і іншых. Кожны год мы прымаем удзел у гарадскіх спаборніцтвах санітарных дружын, дзе нашы студэнты паказваюць выключна нізкія веды ў практычнай рабоце і атрымліваюць сотні штрафных ачкоў, таму што адносяцца да гэтага безадказна.

Іншыя выказваюць меркаванне, што грамадзянская абарона не апраўдала сябе ў склаўшыхся абставінах. А што значыць грамадзянская абарона? Гэта мы з вамі, у яе склад уваходзяць рабочыя, студэнты, служачыя, якія складаюць неваенізаваныя фарміраванні (атрады, каманды, звенні і іншыя). Ад іх падрыхтоўкі і будзе залежыць поспех работы. Ухіленне ж ад гэтага злачынна.

**П. ВАСІЛЬЕЎ,**
**начальнік курса ГА і медыцынскай падрыхтоўкі.**

## ДА ЎВАГІ СТУДЭНТАЎ ВНУ

**У час Усесаюзнага студэнцкага форума ў Маскве да кіраўніцтва Дзяржнавучання СССР паступілі шматлікія звароты.**

**У сувязі з гэтым публікуем памятку, у якой змешчаны правы студэнтаў вышэйшай навучальнай установы.**

Студэнты вышэйшай навучальнай установы маюць наступныя правы:

1. На падставе Часовага палажэння аб вышэйшай навучальнай установе (загад ад 07.08.89 № 585):

1.1. Выбіраць і быць выбранымі ў Савет і Вучоны савет вышэйшай навучальнай установы (факультэта).

1.2. Удзельнічаць праз грамадскія арганізацыі ў рашэнні важнейшых пытанняў дзейнасці вышэйшай навучальнай установы, студэнцкага жыцця.

1.3. Бясплатна карыстацца памяшканнем і абсталяваннем бібліятэк, вучэбных, навуковых і іншых падраздзяленняў, вызначаных Уставам вышэйшай навучальчай установы.

1.4. Вызначаць па ўзгадненню з дэканатам набор дысцыплін навучання па спецыяльнасці ў межах, устаноўленых вучэбным планам, а таксама наведваць дадаткова любыя віды вучэбных заняткаў, якія праводзяцца ў дадзеным інстытуце; ставіць пытанне аб замене выкладчыкаў, якія не забяспечваюць якаснага выкладання вучэбных заняткаў.

1.5. Прымаць удзел у навукова-даследчай рабоце і іншых відах дзейнасці, вызначаных Уставам.

1.6. Вольнае наведванне лекцый, пачынаючы з другога курса.

1.7. На атрыманне пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы работы па спецыяльнасці.

2. На падставе пастановы Міністэрства вышэйшай навучальнай установы СССР, Сакратарыята ВЦСПС і Сакратарыята ЦК УЛКСМ ад 17.06.87 № 435/20-11 ст-7/10а калектывам студэнцкіх груп:

2.1. Выбіраць стараст, прымаць рашэнне аб вызваленні іх ад абавязкаў і ўносіць прапанову ў дэканат аб зацверджанні прынятага студэнцкім калектывам групы рашэння.

2.2. Уносіць прапановы і рабіць запросы ў органы адміністрацыі і грамадскія арганізацыі па ўсіх пытаннях жыццяздольнасці вучэбнай групы.

2.3. Вылучаць кандыдатаў на прысваенне іменных і персанальных стыпендый савета вышэйшай навучальнай установы.

2.4. Хадатайнічаць перад стыпендыяльнай камісіяй аб назначэнні стыпендыі членам вучэбнай групы, якія маюць здавальняючыя адзнакі, а таксама аб назначэнні надбаўкі да стыпендыі за актыўны ўдзел у грамадска-карыснай дзейнасці і аб тым, каб яе зняць.

2.5. Прадстаўляць у рэктарат (дэканат) матываваную думку калектыва вучэбнай групы па пытаннях узнагароды ці спагнання студэнтаў груп, адлічэння іх з вышэйшай навучальнай установы па прычынах, якія не звязаны з непаспяховасцю студэнтаў, атэстацыі і адбора студэнтаў для паглыбленай прафесійнай падрыхтоўкі, выдачы характарыстык і рэкамендацый для навучання ў аспірантуры (ардынатуры).

2.6. Уносіць прапановы ў прафком і студсавет аб размеркаванні месц у інтэрнаце, размяшчэнні ў ім членаў вучэбнай групы.

3. Адтэрміноўкі ад прызыва на ваенную службу для працягвання навучання (пастанова ЦК КПСС і СМСССР ад 31.03.89 № 285).

4. Удзельнічаць у восеньскіх сельгасработах на добраахвотных падставах (загад ад 09.08.89 № 652).

5. Заключаць з дзяржаўнымі, кааператыўнымі і другімі грамадскімі арганізацыямі і прадпрыемствамі індывідуальныя дагаворы на навучанне ў ВНУ (пастанова СМ СССР ад 31.08.89 № 708).

6. Студэнтам універсітэтаў, якія вучацца на спецыяльнасцях, па якіх вядзецца падрыхтоўка педагагічных кадраў, і жадаючым выкладаць дадатковы прадмет, вывучаць адпаведныя дысцыпліны (загад ад 27.02.89 № 146).

7. Студэнтам завочнай формы навучання на падставе загада ад 01.09.89 № 613:

7.1. Па меры падрыхтаванасці здаваць экзамены і залікі па любой дысцыпліне, вывучаемай на адпаведным курсе, незалежна ад іншых прадметаў.

7.2. Атрымліваць працяг навучання пры наяўнасці пэўных прычын, падцверджаных хадатайніцтвам з прадпрыемстваў і арганізацый, дзе яны працуюць.

8. На такую арганізацыю вучэбнага працэса, якая прадугледжвае скарачэнне аудыторных заняткаў на 1—3 курсах да 28 гадзін у тыдзень, на 4—5 курсах да 24 гадзін за кошт замены гэтых заняткаў самастойнай работай студэнтаў пад кантролем выкладчыкаў (загад ад 22.09.86 № 680).

# КРЫНІЦЫ



Ізноў я тут. Цябе вітаю,
Мой родны Горадзень стары!
Ізноў па вуліцах лятаю
Да самай позняе пары.

З цябе нацешыцца няможна
Пасля разлукі ў тры гады!
Як міла плітачка тут кожна,
Дамы, бульварчыкі, сады.

Хрыбты мастоў пераламатых.
Ахвяры скончанай вайны,
Шкада мне вас, параскіданых,
Удалыя Нёмана сыны!

І ты — Нямога Пасяджэння
Магутны замак — як жывеш!
Праб'е часіна адраджэння —
Ізноў ты, мілы, загудзеш!

А ты... Ты — Нёман бела-сіні...
Ой, як харошы, дарагі!
Старыя хвоі, як багіні,
Твае бароняць берагі.

На грудзях хваляў летнім часам
Адпачываў я тут не раз
І часта быў з табой сам-насам,
Аж покуль доўгі дзень не згас.

Цяпер нядоляй пілігрыма
Сюды загнаны незнарок,
Твой быстры бег лаўлю вачыма,
Гляджу і ўздоўж і ўпапярок.

**А. ЦЫХУН,**
**заслужаны настаўнік БССР.**

Фота В. САРОКІНА.

Наш адрас: 230023, г. Гродна, вул. Джешка, 22, пакой 404, тэл. 44-80-70.
Газета выходзіць штотыднёва
Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня вул. Паліграфістаў, 4.
Тыраж 2000 экз. АИ 02006. Зак. 360.
Рэдактар Л. С. ЗАСЕЛЬСКАЯ.